УСТАНОВА АДУКАЦЫІ
«Мінскі дзяржаўны лінгвістычны ўніверсітэт»

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Прарэктар па навучальнай працы
установы адукацыі
«Мінскі дзяржаўны лінгвістычны
ўніверсітэт»
________________А.П. Бяценя
«29» июня 2023 г.
Рэгістрацыйны № 545/02/08-П/ вуч.

# ПАРАЎНАЛЬНАЕ ЛІТАРАТУРАЗНАЎСТВА

Вучэбная праграма установы адукацыі вышэйшай адукацыі
па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці
7-06-0232-02 «Літаратуразнаўства»

2023 г

Вучэбная праграма складзена на аснове адукацыйнага стандарта паглыбленай вышэйшай адукацыі па спецыяльнасці 7-06-0232-02 «Літаратуразнаўства», зацверджанага пастановай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 31.05.2023 № 163 і вучэбных планаў МДЛУ па спецыяльнасці 7-06-0232-02 «Літаратуразнаўства».

**СКЛАДАЛЬНІК:**

М. А. Курыпка, дацэнт кафедры замежнай літаратуры ўстановы адукацыі «Мінскі дзяржаўны лінгвістычны ўніверсітэт», кандыдат філалагічных навук.

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**

Кафедрай замежнай літаратуры ўстановы адукацыі «Мінскі дзяржаўны лінгвістычны ўніверсітэт» (пратакол № 11 ад 07.06.2023);

Навукова-метадычным саветам ўстановы адукацыі «Мінскі дзяржаўны лінгвістычны ўніверсітэт»
(пратакол № 10 ад 29.06.2023)

# I. ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбная дысцыпліна «Параўнальнае літаратуразнаўства» з'яўляецца часткай спецыяльнай падрыхтоўкі магістраў па спецыяльнасці 7-06-0232-02 «Літаратуразнаўства».

Мэта вывучэння вучэбнай дысцыпліны – сфарміраваць навыкі выкарыстання прынцыпаў параўнальнага літаратуразнаўства ў навукова-даследчай дзейнасці.

Асноўнымі задачамі вывучэння вучэбнай дысцыпліны з’яўляюцца:

– фарміраванне уяўлення пра параўнальнае літаратуразнаўства як навуковую галіну ведаў, засваенне паняційна-тэрміналагічны апарату сучаснага параўнальнага літаратуразнаўства;

– авалоданне навучэнцамі навыкамі вызначаць нацыянальную своеасаблівасць і разам з тым акрэсліваць тыпалагічныя сыходжанні вядучых літаратурна-мастацкіх кірункаў, плыняў, школ на ўзроўні змястоўна-фармальнай структуры твораў пісьменнікаў розных літаратур свету;

– развіццё ў магістрантаў здольнасцяў крытычнага асэнсавання фундаментальных прац вядучых прадстаўнікоў айчыннага і сусветнага літаратуразнаўства ў галіне кампаратывістыкі.

У сістэме падрыхтоўкі спецылістаў з вышэйшай адукацыяй у адпаведнасці з вучэбным планам спецыяльнасці 7-06-0232-02 «Літаратуразнаўства» вучэбная дысцыпліна «Параўнальнае літаратуразнаўства» з’яўляецца дысцыплінай кампанету УВА.

У агульнай сістэме прафесійнай падрыхтоўкі спецыялістаў па замежнай літаратуры змест вучэбнай дысцыпліны «Параўнальнае літаратуразнаўства» узаемазвязаны з наступнымі дысцыплінамі:

– «Метадалогія літаратуразнаўчага даследавання»;

– «Паэтыка мастацкага тэксту»;

– «Актуальныя праблемы сучаснага літаратуразнаўства».

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны «Параўнальнае літаратуразнаўства» магістранты мусяць

*ведаць:*

– базавыя паняцці і тэрміны сучаснай кампаратывістыкі;

– заканамернасці літаратурнага працэсу, яго формы, прынцыпы перыядызацыі, формы кантактных сувязяў паміж літаратурамі;

– літаратуразнаўчыя канцэпцыі А.М.Весялоўскага, В.М.Жырмунскага і інш. прадстаўнікоў айчыннай і сусветных школ кампаратывістыкі;

– адметнасці параўнальнага і супастаўляльнага падыходаў ў літаратуразнаўстве;

*умець:*

– выяўляць агульнае і асаблівае ў развіцці сусветнага літаратурнага працэсу ў яго суадносінах з нацыянальным;

– вызначаць тыпалагічныя асаблівасці, а таксама агульнае, што характэрна для таго ці іншага літаратурнага кірунку, метаду, стылю;

– выкарыстоўваць асноўныя паняцці і тэрміны, прыёмы і метады аналізу і інтэрпрэтацыі тэкстаў, прынятыя ў сучаснай кампаратывістыцы;

– самастойна, зыходзячы з наяўных тэарэтыка-літаратурных ведаў, праводзіць параўнальны і супастаўляльны аналіз твораў, якія належаць розным нацыянальным літаратурам і аўтарам;

– характарызаваць спадчыну пісьменніка, яго сюжэты і вобразы праз іх інтэрпрэтацыю ў творчасці прадстаўнікоў іншай эпохі і нацыі;

– выкарыстоўваць назапашаны вопыт для развіцця навыкаў навукова-даследчай дзейнасці пры рабоце з мастацкім творам.

*валодаць:*

– навыкамі кампаратыўнага аналізу твораў, прыналежных да розных нацыянальных літаратур;

– метадалогіяй даследчай і практычнай працы ў вобласці літаратуразнаўчай кампаратывістыкі;

адпаведнай літаратуразнаўчай тэрміналогіяй.

У адпаведнасці з вучэбнымі планамі па спецыяльнасці 7-06-0232-02 «Літаратуразнаўства» вывучэнне вучэбнай дысцыпліны накіравана на фарміраванне наступнай кампетэнцыі:

СК-5 – Выкарыстоўваць прынцыпы параўнальнага літаратуразнаўства ў навукова-даследчай дзейнасці.

У адпаведнасці з вучэбнымі планамі спецыяльнасці 7-06-0232-02 «Літаратуразнаўства» агульная колькасць гадзін, якія адведзены на вывучэнне вучэбнай дысцыпліны «Параўнальнае літаратуразнаўства», складае 102 акадэмічныя гадзіны, з якіх колькасць аўдыторных гадзін складае 50 гадзін для вочнай формы навучання (28 гадзін лекцыйных заняткаў і 22 гадзіны практычных заняткаў) і 12 гадзін для завочнай формы навучання (6 гадзін лекцыйных заняткаў і 6 гадзін практычных заняткаў). Самастойная праца студэнтаў плануецца ў аб'ёме 52 акадэмічныя гадзіны (вочная форма навучання) і 90 гадзін (завочная форма навучання).

Вучэбная дысцыпліна вывучаецца на працягу другога семестра (вочная форма навучання) і трэцяга семестра (завочная форма навучання).

Формай прамежкавай атэстацыі па вучэбнай дысцыпліне з'яўляецца залік па заканчэнні другога семестра (вочная форма навучання) і трэцяга семестра (завочная форма навучання). Працаёмкасць вучэбнай дысцыпліны «Параўнальнае літаратуразнаўства» складае 3 заліковыя адзінкі.

Форма атрымання вышэйшай адукацыі – вочная / завочная.

Заняткі праводзяцца на беларускай / рускай мове.